**Інтэрнэт-музей “Выток Нёмана. УЗДЗЕНШЧЫНА”**
**http://istoknemana.ucoz.org/**

**Уздзенскі гісторыка-краязнаўчы музей**
**http://uzda.museum.by/**

# Творчы праект:

# “ВЫТОК НЁМАНА – выток духоўнасці”

на абласны агляд-конкурс
на лепшую арганізацыю ідэалагічнай работы




Узда, 2013

# Дзяржаўная ўстанова "Уздзенскі раённы гісторыка-краязнаўчы музей" рэалізуе праект “ВЫТОК НЁМАНА – выток духоўнасці”

## Мэта:

Паказаць значымасць геаграфічных, гістарычных, культурных аб’ектаў і таленавітых людзей Уздзеншчыны як сімвалаў духоўнай асветы краіны.

## Задачы:

- Вывучэнне, захаванне і папулярызацыя гісторыка-культурнай спадчыны Уздзеншчыны і таленавітых людзей, праслвіўшых родны край.

- Выхаванне патрыятызму і пачуцця гонару ў жыхароў, асабліва маладога пакалення, фарміраванне беражлівых адносін да стваральнай працы продкаў і сваёй малой радзімы.

- Развіццё рэгіянальнага аграэкатурызму, стварэнне аб’ектаў турыстычнай інфраструктуры з улікам сучасных патрабаванняў.

- Захаванне і адраджэнне малых (неперспектыўных) сельскіх мясцовых населеных пунктаў, навядзенне парадку на зямлі.

- Павышэнне ўзроўню якасці жыцця і дабрабыту мясцовага насельніцтва, забеспячэнне яго новымі працоўнымі месцамі.

## Метады і формы:

- На базе музея стварыць **цэнтр краязнаўчай дзейнасці "Выток Нёмана. Уздзеншчына"** як адзінае звяно паміж кіруючымі структурамі, грамадскімі арганізацыямі, прадпрымальнікамі, СМІ, прыватнымі асобамі.

- Арганізаваць **Апякунскі Савет** для аб'яднання намаганняў улады, бізнеса, творчых людзей і кантралявання выкарыстоўвання спонсарскай дапамогі.

- Стварыць **інфармацыйную сетку** для распаўсюджвання матэрыялаў па бібліятэках, музеях, школах, установах як праз Інтэрнэт, так і на друкаваных і электронных носьбітах.

- Распрацаваць **турыстычныя брэнды** для прыцягнення турыстаў і развіцця турыстычнага патэнцыялу:

  ***"Выток Нёмана. Уздзеншчына"***

  ***"Алея Кандрата Крапівы"***

- Напісаць гімн Уздзенскага раёна.

- Распрацаваць **аздараўляльныя турыстычныя маршруты,** пешыя і аўтавеламотапрабегі, па сакральных і гістарычных месцах і зрабіць іх віртуальны варыянт:
  - ✓ *выток Нёмана*
  - ✓ *месцы зліцця рэк*
  - ✓ *жыватворныя крыніцы*
  - ✓ *дрэвы-волаты*
  - ✓ *помнікі прыроды (валуны і г.д.).*

# Гістарычная спраўка

*Уздзеншчына стала калыскай для многіх песняроў, майстроў мастацкай прозы і паэтычнага радка. Адсюль, дзе бярэ свой пачатак адна з прыгажэйшых беларускіх рэчак – Нёман, выйшлі 23 пісьменнікі, 11 акадэмікаў, 28 вучоных, 14 мастакоў Саюза мастацтва Рэспублікі Беларусь.*

*Уздзенскі раён размешчаны ў цэнтральнай частцы Мінскай вобласці ў 60 км ад Мінска. Агульная плошча 1,2 тыс.км². Колькасць насельніцтва складае 23,1 тыс.чалавек. У раёне 203 населеных пунктаў.*

*У пісьмовых крыніцах Узда ўпершыню ўпамінаецца ў 1494 годзе.*

*З дакументаў Літоўскай метрыкі вядома, што ўнучка аднаго з уладальнікаў Узды – Васіля Корсака – Анастасія Андрэеўна выйшла замуж таксама за прадстаўніка рода Корсакаў – Глеба Астаф'евіча.*

*Вельмі даўно ў гэтых месцах пасяліліся людзі. Яшчэ ў IV—III тысячагоддзях да нашай эры тут ужо існавала так званая Нёманская культура. Ёсць звесткі, што ад III ст. да нашай эры тут пражывала насельніцтва балцкага паходжання. У VIII-IX стст. па рэках чарнаморскага басейна сюды прыйшлі дрыгавічы, якія асімілявалі абарыгенаў. Аб чым сведчаць шматлікія археалагічныя знаходкі на месцах старажытных паселішчаў, гарадзішчаў, курганных магільнікаў.*

*Дакладна невядома, калі і адкуль узнікла назва Узда. Даследчыкі паясняюць яе па-рознаму. Адно з тлумачэнняў выводзіць яе са слова "вуздэчка" (частка коннай збруі) і звязвае са старажытнай легендай. Другое тлумачэнне назвы Узда выводзіцца са старажытнага літоўскага слова "узла", што азначае насціл праз балота – грэблю. Трэцяе тлумачэнне звяртаецца да татарскай мовы і звязвае яе са словаўтварэннем "паселішча на рацэ Уса" (па-татарску – Усда).*

*Мае месца і яшчэ адна трактоўка, звязаная са старажытна-рускай назвай абарончых умацаванняў, якія будаваліся ў XV–XVI стагоддзях на ўскраінах Русі для абароны ад набегаў качэўнікаў. Вядома, што ў другой палове XVI стагоддзя пры Маскоўскім князю Івану III такія ўмацаванні, пабудаваныя ўздоўж рэк Акі і Угры, насілі назву "Вялікай Узды".*

*У той жа час назва горада паходзіць, несумненна, ад назвы ракі, на якой ён стаіць. Цяпер назва ракі – Уздзянка, раней яна была – Узда. Уяўляе сабой зменшаную форму той жа асновы, што і Уса (прытокам якой з'яуляецца). Адбылася трансфармацыя Уса – Усда. Не выключана агульная сувязь Узда – Уса – Уша.*

*У раёне захаваліся свяцілішчы – месцы язычніцкага набажэнства, памятныя камяні і прошчы. Гэта камень каля в.Верх–Нёман, які стаяў каля вадзяного акенца, адкуль бралі свае вытокі Нёман і Лоша. Два велізарныя камяні 7х4х2 м каля в.Камяное, помнікі прыроды рэспубліканскага значэння. Сакральны валун, пад назвай "Сьяты камень", каля в.Госьбішчы.*

*На Уздзеншчыне можна наведаць месцы, надзеленыя, паводле ўяўленняў вернікаў, незвычайнымі надпрыроднымі сіламі і ўласцівасцямі.*

*Помнікі архітэктуры ў краі – гэта Петрапаўлаўская царква ў в.Возера, Кальвінскі збор (XYIст) у п.Першамайск, капліца–пахавальня рода Завішаў, былы касцёл Святога Крыжа.*

*Гісторыя былога ўздзенскага касцёла азначана адной цікавай падзеяй. Продкі Янкі Купалы з даўніх часоў жылі каля в.Магільна. 12 мая 1846 года ў будынку ўздзенскага касцёла быў учынены запіс аб нараджэнні Даменіка Ануфравіча — бацькі праслаўленага песняра беларускага народа. Па дадзеных даследчыка А. Валахановіча, дзед Я. Купалы Луцэвіч Ануфры Дамінікавіч нарадзіўся ў 1814 годзе на Уздзеншчыне ў в. Забалацце. Ён арандаваў у Радзівілаў зямлю ў засценку Пяскі (інакш – Лазаравічы, Луцэвічы), які ўваходзіў у маёнтак "Святы Двор" і мясціўся паміж Запруддзем і Замосцем каля вёскі Літва, што непадалёк ад дарогі з Магільна на Узду.*

*На Чырвонай плошчы ў цэнтры горада размешчана царква Пятра і Паўла, пабудаваная на месцы драўлянай у 1840 годзе ўладальнікам Узды Фадзеем Завішам.*

*Помнікі сядзібна–паркавай архітэктуры: сядзіба Кухцічы, дзе жыў і працаваў Мацей Кавячынскі, беларускі кнігавыдавец, перакладчык, рэфармацыйны дзеяч. Нясвіжскі намеснік ("спраўца всех замков и дворов») Мікалая Радзівіла Чорнага. Заснавальнік, разам з Сымонам Будным і Л.Крыштоўскім, паперні і друкарні ў Нясвіжы, якая ў 1562г. надрукавала першыя на тэрыторыі Беларусі выданні на беларускай мове – "Катэхізіс" і "Пра апраўданне грэшнага чалавека перад Богам". Была пачата работа па выданні Біблії на беларускай мове. Ва ўступе да яе Сымон Будны зрабіў спробу крытыкі Новага Запавету. Напісанне гэтага ўступу было зроблена ва Уздзе і датавана 1572 годам. Давесці гэту работу да канца ў Нясвіжы ім не ўдалося, бо Мікалай Крыштаф Радзівіл, уладальнік Нясвіжа, спыніў дзейнасць друкарні, перайшоўшы ў каталіцызм. Ёсць меркаванні даследчыкаў, якія лічаць што апошнія лісты кнігі друкаваліся ў Кухціцкім маёнтку. Прадмова братоў Кавячынскіх датавана з Узды 30.YI.**

*Сядзіба Над–Неман – радзіма Якава Атонавіча Наркевіча-Ёдка, прыродазнаўцы, доктара медыцыны, прафесара. Месца, дзе быў*

*пабудаваны адзін з першых санаторыяў на Беларусі і дзе ў першыню было вынайдзена радыё.*

*Асноўная творчая праца вучонага праходзіла ў яго вотчынным маёнтку "Над-Нёман", там была створана навуковая база. Апрача метэаралагічнай станцыі, палёў электракультывацыі і электратэрапеўтычнага кабінета тут дзейнічалі электраграфічная, электрабіялагічная і астранамічная лабараторыі. Метэаралагічная станцыя 1–га разраду ўваходзіла ў састаў Галоўнай фізічнай абсерваторыі Расіі.*

*У сваім санаторыі вучоны выкарыстоўваў для лячэння і новы бескантактны метад электратэрапіі, які праходзіў за мяжой як "метад Ёдкі". У санаторыі з 1892 года была арганізавана вытворчасць кумысу (магчыма, упершыню на Беларусі) і кефіру.*

*Яшчэ ў 1890 годзе з вежы яго сядзібнага дома ў " Над–Нёмане" рэгістраваліся разрады электрычнасці ў атмасферы на адлегласці да 100 кіламетраў. А 12(24) лютага 1891 года вучоны ўпершыню дэманстраваў у Пецярбургу вынайдзены ім "бяздротавы тэлеграф" — папярэднік сучаснага радыётэлеграфа.*

*Наднёманскі маёнтак наведвалі вучоныя з сусветнымі імёнамі. Сюды прыязджалі прафесары А. Ваейкаў, А. Саветаў з Пецярбурга, знакаміты французскі астраном К. Фламарыён.*

*Дзякуючы Я. Наркевічу-Ёдку "Над–Нёман" стаў вядомы далека за межамі не толькі Міншчыны і Расіі, але і ў многіх навуковых цэнтрах Еўропы. Вучонага па вядомасці параўноўвалі да Л. Пастэра, а галоўнае яго адкрыццё – электраграфію – да адкрыцця В. Рэнтгена.*

*Як жа не ганарыцца і не захоўваць такую багатую спадчыну?*

*Таму ў нашым раёне вялікая ўвага надаецца развіццю краязнаўства.*

*Ёсць усе падставы сцвярджаць, што, як і ў іншых народаў, краязнаўства на Уздзеншчыне бярэ свой пачатак з самай глыбокай старажытнасці і было паклікана да жыцця найперш за ўсё практычнай неабходнасцю. Бо каб нашыя далёкія прашчуры старанна не вывучалі, разумна не выкарыстоўвалі акружаючае іх асяроддзе, яны не выжылі б у тых надзвычай цяжкіх умовах.*

*Вывучэнне мінулага, веданне сучаснага, прагназіраванне будучага неабходны для жыцця нашай Радзімы, выхавання нацыянальнай самасвядомасці беларусаў.*

# Прэзентацыя праекта

Усё мае свае вытокі: слова, рака, традыцыі, чалавечы род. Наша Уздзеншчына – зямля незвычайна пладавітая, шчодрая на таленты. Яна нарадзіла славутую раку нашай Бацькаўшчыны - Нёман.

У праекце, які мы прапануем Вашай увазе - **“Выток Нёмана – выток духоўнасці”** - сканцэнтравана агульначалавечая ідэя яднання ўсяго сутнага дзеля працягу Жыцця ў нашым прыгожым доме пад назваю Зямля.

***Мы паспрабавалі мысліць глабальна і дзейнічаць лакальна.***

***І зараз прапануем вашай увазе вынікі нашай працы.***

Зусім невыпадкова ў старажытнасці наш Нёман называлі людзі Хронасам, ракой часу, а землі Наднямоння – **Літвою**, што ў перакладзе з угра-фінскай азначае **пяцірэчча**.

**Літ** – пяць, **ва** – вада (рака). **Літва**, **Ліцвяны**, **Літавор**…- гэтыя назвы да сённяшніх дзён захаваліся на нашай Уздзенскай зямлі, як сведкі, як памяць мінулых часоў. А Нёман жа якраз і ўтвараецца ад зліцця пяці рэк: **Неманца, Лошы, Усы, Уздзянкі і Ператуці.**

Цікава, што літаральна ўсе культуры свету, як быццам змовіўшыся, праводзяць аналогіі паміж рэкамі і часам. А сёння некаторыя вучоныя нават сцвярджаюць, што вада - сапраўды носьбіт інфармацыі і здольная перадаваць яе людзям. І нездарма ж Жыццё здавён імкнулася да рэк.




Менавіта ўздзенская зямля дае Нёману свае нескупыя дары, маладую сілу. Без гэтай жыватворнай сілы не разліўся б ён так магутна і шырока на зялёных прасторах Гродзеншчыны і Літвы.

Нёман у розныя часы натхніў на творчасць незлічоную колькасць паэтаў, мастакоў, кампазітараў, навукоўцаў – філосафаў.

Рэдка які рэгіён можа пахваліцца такой колькасцю творчых людзей на душу насельніцтва. У раёне пражывае толькі 23,1 тысяч чалавек, а выйшлі адсюль у свет **11** акадэмікаў, **28** вучоных, **23** пісьменнікі, **14** мастакоў, адным словам – творчы край!

Такое ўражанне, што тут пішуць літаральна ўсе: старыя, маладыя, дзеці... Нават калі і не пішуць, то неардынарна мысляць і гавораць у рыфму, па-народнаму трапна, афарыстычна.

А цяпер мы з вамі зробім вандроўку па пяці рэках, якія даюць пачатак Нёману як сімвалу духоўнасці.

## Нёманец у нашым уяўленні - сімвал навуковага пазнання




Сусветнавядомае імя

**Якуба НАРКЕВІЧА-ЁДКІ**.

Беларускі прыродазнавец, вынаходнік, доктар медыцыны, прафесар, Член-карэспандэнт Расійскага геаграфічнага таварыства, ён пабудаваў у сваім маёнтку Наднёман метэаралагічную станцыю. Вынайшаў спосаб бяспроваднай перадачы і прыёму электрамагнітных хваль на адлегласці (першы ў свеце правобраз радыёпрыёмніка). Стварыў лізіметр — прыладу для вымярэння вільготнасці глебы. Распрацаваў спосабы вымярэння патэнцыялу атмасфенай электрычнасці, спосаб лячэння нервовахворых электратокам. Прапанаваў выкарыстанне метаду электраграфіі для дыягностыкі захворванняў. Акадэмік Усесаюзнай акадэміі сельскагаспадарчых навук (ВАСХНИЛ)

**Васіль Васільевіч Пашкевіч** увайшоў ў гісторыю як галоўны садавод Расіі 19 ст. З імем нашага земляка звязана апублікаванне ў 1894 г. першага рускага дапаможніка па культуры лекавых і духмяных раслін. Ён выдатны памолаг, знаўца яблыневых парод.

**Аляксандр Сямёнавіч Махнач** - адзін з вядучых беларускіх геолагаў, відны арганізатар навукі, акадэмік Акадэміі навук Беларусі, доктар геолага-мінералагічных навук, прафесар, заслужаны дзеяч навукі Удзельнічаў у пошуках і адкрыцці радовішчаў калійнай і каменнай солі ў Беларусі. За адкрыццё і разведку нафты яму прысвоена Дзяржаўная прэмія Беларусі.

**Барыс Васільевіч Бокуць** - фізік, акадэмік НАН Беларусі, доктар фізіка-матэматычных навук, прафесар , заслужаны дзеяч навукі Беларусі.

**Сям’я Лычоў:** доктар гістарычных навук Леанід Міхайлавіч; доктар эканамічных навук, акадэмік АН Беларусі, дырэктар Інстытута эканомікі АН Беларусі Генадзь Міхайлавіч; эколаг, кандыдат навук, загадчык лабараторыі АН Беларусі Анатоль Міхайлавіч.

Гэта далёка няпоўны пералік тых, хто ўнёс значны ўклад у развіццё навукі.

# Лоша - сімвал творчага асэнсавання рэчаіснасці




Нездарма Уздзеншчыну называюць **“Беларускім Парнасам”.** Пісьменнікі, мастакі, музыканты, акцёры сфарміравалі гэты стойкі вобраз.

**Фадзей Булгарын** — беларус, імя якога назаўсёды ўпісана ў гісторыю рускай літаратуры пушкінскай пары. Тут ён нарадзіўся, затым апісаў гэта месца ў сваіх творах. Ф. Булгарын быў піянерам у асваенні рускай літаратурай новых жанраў: побытаапісальнага рамана, нарыса, фельетона, ваеннага апавядання. Яму належалі першыя ў рускай літаратуры вопыты ў жанрах утопіі і антыутопіі

Хто не ведае імя слыннага сына беларускай зямлі **Кандрата Крапівы**?! Праз стагоддзе яго талент не толькі не губляе сваю таямнічую сілу ўздзеяння на чалавечыя душы, але наадварот: і сёння людзі з цікавасцю звяртаюцца да яго творчасці, знаходзяць усё новыя і новыя перлінкі мудрасці і зіхоткія алмазы ісціны.

*Я ў мастацкім агародзе*
*Толькі марная трава.*
*А якая? Смех, дый годзе:*
*Я – пякучка-крапіва.*
*Я расту вось тут пад плотам*
*І не так даўно ўзышла,*
*А ўжо многім абармотам*
*Рукі-ногі папякла.*

*Хто палез за агуркамі,*
*Хай той носіць пухіры-*
*Мяне голымі рукамі*
*Асцярожна, брат, бяры.*
*Хто сустрэўся быў са мною,*
*Дакрануўся раз ці два,*
*Дык той ведае ўжо, хто я:*
*Я – пякучка-крапіва.*




Дыяментам блiснула i творчасць нізаўскога паэта **Паўлюка Труса**. Тут, у краі “адвечных песень, казак”, упершыню прагучалі яго вершы, непаўторныя, крыштальна чыстыя, як нёманскія хвалі.

З Вялікай Усы вядомы пісьменнік, вучоны, акадэмік АН Беларусі **Пятро Глебка**.

Пабачыў свет на берагах Нёмана ў старажытным мястэчку Магільна добра вядомы і ўшаноўваемы на Захадзе мастак-імпрэсіяніст **Яўген Зак.** Пасля заканчэння ў Варшаве гімназічнай адукацыі ён перабраўся ў Парыж, прымкнуўшытам да імпрэсіяніcцкага асяродка "Парыжскай школы". Яўген Зак змог вылучыцца сваім адметным мастацкім стылем. Ад яго пазней узялі прыклад мастакі М.Шагал, Х.Суцін. У яго творах адчуваецца "дыялог традыцыі з сучаснасцю", праявы экспрэсіянізму.

Без малога чатыры дзесяткі гадоў на самых розных творчых аглядах нязменным поспехам карыстаюцца работы рускіх мастакоў, братоў **Сяргея і Аляксея Ткачовых,** якія чэрпалі натхненне на Уздзеншчыне.

Творы іх пляменніка, мастака **Уладзіміра Ткачова**, таксама вядомы ў нашай краіне і за яе межамі. Яго габелены ўпрыгожваюць залы Беларускай дзяржаўнай філармоніі ("Музыка"), рэзідэнцыю Кабінета Міністраў краіны ("Беларусь"); вітражы — Беларускі тэатр юнага гледача ("Песні Беларусі", "Поры года"), файе нашага музея .

Мастакі **Сцяпан Андруховіч**, **Іван Салавей**, **Юзаф Пучынскі**, **Міхась Рагалевіч**, скульптар **Уладзімір Лятун** зрабілі значны ўнёсак у скарбніцу духоўнасці.

**Нёманец (сімвал навуковага пазнання)** і **Лоша (сімвал творчага асэнсавання рэчаіснасці)** у шматлікіх легендах надзелены рысамі дзяўчыны і хлопца, якія, як гэта часта бывае сярод людзей, нарадзіўшыся з адной крыніцы, разбягаюцца ў розныя бакі, зразумеўшы, што яны зусім розныя і не жадаючы прынараўлівацца адзін да аднаго. Але з цягам часу пачынаюць сумаваць, шукаць шляхі да згоды, бо толькі разам яны могуць даць пачатак новаму жыццю. Такі закон прыроды і развіцця чалавечага грамадства.

А яшчэ народныя філосафы, праводзячы аналогіі паміж прыродай і чалавекам, лічылі, што разгадаць таямніцу Жыцця можна толькі аб'яднаўшы **матэрыяльнае**, **душэўнае** і **духоўнае**: **навуковае (эксперыментальнае) пазнанне, творчае асэнсаванне рэчаіснасці і веру ў дапамогу вышэйшага розуму (Бога).**




І гэта трыядзінства пазнання і шляху да ўдасканалення зашыфравана ў тым, што амаль адразу ж пасля зліцця **Лошы** і **Нёманца** да новай ракі далучаецца **Уса - сімвал веры**.

Заўважце, не да Лошы ці да Нёманца, а да Нёмана, іх сумеснай перамогі над раз'ядноўваючым эгаізмам і ганарлівасцю.

Уздзеншчына заўсёды была месцам, дзе мірна суіснавалі розныя канфесіі.

Яркім прадстаўніком хрысціянскай маралі праваслаўя быў **Завітневіч Уладзімір Зянонавіч**, беларускі археолаг, гісторык, доктар царкоўнай гісторыі, прафесар. Нарадзіўся ў 1853 г. непадалёк ад Усы, у сям'і патомнага праваслаўнага святара.

На Уздзеншчыне жыў, служыў Богу і людзям свяшчэннапакутнік Мінскай Епархіі, пратаіерэй **Міхаіл Навіцкі**, настаяцель царквы Святых Апосталаў Пятра і Паўла.

Тут нарадзіўся адзін з сусветнавядомых равінаў - **Машэ Файнштэйн**, найбуйнейшы галахічны аўтарытэт габрэйскага народа другой паловы ХХ стагоддзя, кіраўнік ешывы «Месивта Тиферес Ерусалім» ў Нью-Ёрку.

А што ж сімвалізуе загадкавая **Уздзянка**, якая сілкуе сваімі водамі Усу?




Відавочна, што гэта – **сімвал мудрасці ўладароў**, невычэрпная скарбніца волатаў розуму, велікадушнасці, якія ўмеюць трымаць ва ўздзе сваю гардыню: **ад Пацаў, Кавячынскіх, Радзівілаў,** што ўладарылі тут у мінулыя стагоддзі, да таленавітых сучаснікаў, якімі ганарыцца гэта цудоўная зямля.



Нездарма ж менавіта ў гэтых мясцінах жыла шчодрая мецэнатка **Магдалена Радзівіл.** Гэта дзякуючы ёй пабачыў свет адзіны прыжыццёвы зборнік паэзіі Максіма Багдановіча “Вянок”, зборнікі Канстанцыі Буйло, Ядвігіна Ш., Якуба Коласа.

Яна фінансавала беларускія выдавецтвы, школы, тэатры, музеі... – усё, што датычыла культуры, што яна лічыла важным для Бацькаўшчыны, чалавецтва. Гэта яна, маленькая гаспадыня вялікага шчодрага сэрца, была адной з заснавальніц у Санкт – Пецярбургу першага беларускага выдавецтва “Загляне сонца і ў наша ваконца”. Гэта пад яе фінансавым дахам выдаваліся газеты “Беларус” і “Наша Ніва” і дзейнічала бібліятэка беларускай суполкі пры Расійскай акадэміі.

І па сённяшні дзень у маляўнічым месцы сутоку Уздзянкі і Усы стаіць храм – Кальвінскі рэфарматарскі збор – архітэктурна-рэлігійны помнік абарончага тыпу сярэдзіны XVI ст., адзін са старэйшых помнікаў на Беларусі. Пабудаваны на сродкі **Мацея Кавячынскага**, які быў цесна звязаны з распаўсюджваннем асветы і кнігадрукавання на Беларусі, з дзейнасцю паслядоўніка Ф.Скарыны Сымона Буднага, аднаго з выдатных дзеячаў беларускага Адраджэння. Апошнія раздзелы Бібліі друкаваліся менавіта ў Кухцічах.

## Менавіта дзейнасць асветнікаў з’яўляецца тым звяном, якое аб’ядноўвае ўсе здаровыя стваральныя сілы грамадства

Такім чынам, апошняя, пятая рэчка пад незвычайнаю назваю **Ператуць**, якая таксама ўпадае ў **Усу** ля мястэчка Кухцічы, безумоўна, - **сімвал згоды, паразумення, адзінства**. А падказка ў самой назве: прыстаўка **пера-** азначае **пера**адолець нешта (**пера**йсці, **пера**плыць, **пера**скочыць…)

А гэта значыць, што мы павінны перайсці тут, у гэты час, у гэтым жыцці мяжу непаразумення, каб даць працяг новаму жыццю.

Іншага не дадзена.




Для дасягнення пастаўленай мэты мы павінны аб’яднаць розныя сілы. Як нельга дарэчы выйшла пастанова Саветам міністраў № 308 ад 12.03.2011 г. «Аб апякунскай радзе», якая дае магчымасць выкарыстоўваць спонсарскую дапамогу, аб’яднаць намаганні **ўлады**, **бізнесу**, **творчых людзей**, **грамадскасці**, **сродкаў масавай інфармацыі**.

**“Я на Зямлю прыйшоў не для таго, каб жменяй поўнай уцехі браць, я аддаваць люблю,”** – так напісаў пра сябе наш беларускі паэт **Ніл Гілевіч**.

Гэтыя словы сталі дэвізам нашай дзейнасці па наступных накірунках.

## Па праекту "Выток Нёмана – выток духоўнасці" ужо зроблена:

1. Выкарыстоўваючы сучасныя тэхналогіі ўпарадкаваны неабходныя матэрыялы і выведзены як у друкаваным выглядзе, так і ў электронным (у форме мультымедыйных кніг), а інфармацыя запісана на DVD-дыску. Такім чынам, яна становіцца даступнай як для арганізацый, так і для прыватных асоб як у раёне, так і ў любой кропцы зямнога шара.

2. Выпушчана 5 часопісаў "Выток Нёмана. Уздзеншчына" з усімі дадатковымі матэрыяламі на DVD-дысках, больш за 10 брашур аб мастаках, вядомых людзях Уздзеншчыны (гл. Дадатак).

3. Арганізаваны выпуск штомесячнага культурна-асветніцкага **часопіса "Выток Нёмана. Уздзеншчына"** аб людзях, гісторыі, прыродзе нашага краю, які можа быць цікавы самым розным слаям нашага грамадства: педагогам і навучэнцам, дарослым і дзецям, гараджанам і сельскім жыхарам, прадпрымальнікам і творчым людзям, кіраўнікам і іх падначаленым - як тым, хто жыве тут, так і тым, хто раз'ехаўся па велізарным свеце.

4. Створаны **сайт "Выток Нёмана. Уздзеншчына"**, які злучае звяно паміж выхадцамі Уздзеншчыны ва ўсім свеце, спачатку ў сацыяльнай сетцы MAIL.RU, потым на платформе UCOZ з магчымасцю падключэння платных паслуг, у прыватнасці, модуля "Інтэрнэт-Крама".

5. Вынік дзейнасці за некалькі месяцаў у Інтэрнэце стаў адразу ж прыкметны: задаўшы праз пошукавую сістэму - напрыклад, GOOGLE, словы "выток Нёмана", "Уздзеншчына" на рускай або беларускай мовах, ужо можна знайсці шмат матэрыялаў - публікацый, малюнкаў, фільмаў па гэтай тэме.

6. Адкрыта і працуе **электронная рассылка "Выток Нёмана. Уздзеншчына"**, калі адрасат атрымлівае на свой электронны адрас спецыяльна падрыхтаваныя матэрыялы, а архіў падпіскі даступны ў Інтэрнэце для наступных падпісчыкаў.

7. Дзейнічаюць філіялы **інтэрнэт-музея "Выток Нёмана. Уздзеншчына"** в Однокласниках и Вконтакте.

8. Наступны крок - асваенне свабоднай энцыклапедыі - **ВІКІПЕДЫІ**, дзе матэрыялы можна сістэматычна выкладваць на розных мовах, і тады Уздзеншчына стане праз Сусветную Павуціну і нашы намаганні вядомая ва ўсім свеце.

**Давайце ствараць будучыню разам!**

# Дадатак

- ***Часопіс “Выток Нёмана. Уздзеншчына” + DVD-дыск***
- ***Інфармацыйнае выданне “Песні Узденшчыны” + DVD-дыск***
- ***Інфармацыйнае выданне “Наш зямляк Фаддей Булгарын” + DVD-дыск***
- ***Інфармацыйнае выданне “Феерический мир Айши Александрович” + DVD-дыск***
- ***Відэафільм “Калыска Нёмана. Пачатак”***
- ***Відэафільм “11.01.2013. Адкрыццё выстаўкі Мікалая Мішчанкі ў Уздзенскім раённым гісторыка-краязнаўчым музеі”***
- ***Відэафільм “15.02.2013. Экскурсія па выстаўцы пяці мастакоў у Уздзенскім дзяржаўным сельскагаспадарчым прафесійным ліцэі”***